# «Кураслеп рассыпаў па ёй сваё тлустае золата...»

## Веснавыя кветкі на старонках літаратурных твораў



*Прыгрэла сонейка.*
*На ўзлеску*
*Птушыны спеў*
*Чуваць здаля...*
*Стаіць і слухае пралеска,*
*Як ціха*
*Дыхае зямля.*

У задуменна-лірычным вершы Авяр'яна Дзяружынскага пяшчотная веснавая кветка — увасабленне мудрасці прыроды.

Шмат каго з беларускіх паэтаў і пісьменнікаў натхнялі шматлікія першацветы... Але ж ці ведаем мы іх сапраўдныя назвы? Пралескамі найчасцей называем белы кураслеп дуброўны і сінюю пралеску высакародную, менавіта яны найчасцей утвараюць прыгожыя кветкавыя дываны ўвесну... Многія з нас імкнуцца ўласнаручна сарваць пяшчотныя першыя кветачкі, прынесці ў хату сведчанне таго, што зямля абудзілася ад зімовага сну... Але тым самым мы наносім шкоду прыродзе. Лепей любавацца гэтымі вонкава пяшчотнымі, а насамрэч вельмі трывалымі раслінамі, якія мужна пераадольваюць халады, у лесе, на лузе... Можна паназіраць за імі і на старонках літаратурных твораў.

### Прадвеснікі Перамогі

Максім Танк напісаў верш «Пралескі» ў 1944-м годзе, калі быў далёка ад захопленай ворагам радзімы і працаваў у франтавой газеце «За савецкую Беларусь». Беларускі штаб партызанскага руху ў той час знаходзіўся ў Падмаскоўі, часта бываў паэт і ў Маскве. Магчыма, там і склаў гэты верш, таму што напачатку апісваецца тлумны горад, дзе толькі асфальт, трамваі і туга па радзіме...

*«І раптам бачу: на рагу,*
*У прадаўшчыцы-маладзіцы,*
*Маю блакітную тугу —*
*Букет пралесак залаціцца.*
*І хоць на захадзе гарыць*
*Чырвоным сонца светафорам,*
*Я сэрцам зноў ля тых крыніц*
*І акрываўленых разораў,*
*Дзе на пакінутай зямлі,*
*На папялішчах, пералесках,*
*Як пад Масквою, расцвілі*
*Таксама першыя пралескі.*
*Ды сёння ў роднай старане*
*Каму яны азораць шчасце?*
*На безыменным кургане*
*Ім суджана вянком апасці.*
*Але за то, што расцвілі*
*Прадвеснікамі перамогі*
*На шматпакутнае зямлі,*
*На астравінах баравых,*
*Ля нашых спаленых парогаў —*
*Ад сэрца блаславіце іх,*
*Хто памятае, у край дарогу».*

Пралескі ўвасабляюць не проста надыход вясны — яны сімвал непазбежнай перамогі, хуткага вызвалення роднай зямлі ад сцюжы акупацыі, сімвал неўміручай моцы народа, памяці пра загінулых.

### «Кволыя пралесачкі... Нейкае трывогі не схаваць, не схаваць»

У абразку Максіма Гарэцкага «Вясна», напісаным у 1914 годзе, згадваюцца іншыя веснавыя кветкі — «жоўтыя красачкі», якія растуць ля балота. Што за яны? Можа быць, першацвет веснавы — адзін з відаў прымулы, можа быць, жоўтая фіялка ці крокусы? А мо гэта лотаць, якая якраз цвіце ў балоцістых мясцінах з красавіка?

*«Гэй вы, шчасныя веснавыя дні! Ганначка, сястрыца! Пойдзем у таўкачыкі, а на лагу там ля балота жоўтых красачак нарвём.*

*І дзеразы зялёненькай, лахматай надзяром, і яленцу наламаем, і шышачак набяром: азелянім, ахарошым сваю хатку старэнькую.*

*Макравата яшчэ ў полі, зямелька не высахла...*

*А ты лапцікі абуй.*

*Люблю цябе, прыгожая, за тое, што на грудзёх у цябе красачкі прышпілены. Ах, люблю я красачкі!*

*І аб чым ты, дзяўчынка мая, так задуманая? Чаго твае вочачкі чыстыя засмуціліся? Кволыя пралесачкі... Нейкае трывогі не схаваць, не схаваць».*



Трывога, якую адчувае герой абразка, недарэмная... Праз некалькі месяцаў пачнецца Першая сусветная вайна. Максім Гарэцкі трапіць на фронт, будзе цяжка паранены, ледзь выжыве. Сумная доля чакае і яго сястру Ганну, прыгажуню і разумніцу. У 1922 годзе, у Маскве, яна павязе перадачу іх арыштаванаму брату і трапіць пад трамвай. Яе памяці Максім Гарэцкі прысвеціць складзеную ім хрэстаматыю беларускай літаратуры, Уладзімір Дубоўка — зборнік «Строма»: «Светлай памяці Ганулі Гарэцкай, як вяночак на магілку ў чужыне, — прысвячаю».

Сумныя жоўтыя красачкі ў тым вяночку...

### «Праслічная, паўночная фіёлка»

Верш Алеся Гаруна, напісаны ў 1920 годзе, які таксама называецца «Пралескі», звернуты да жанчыны, якая прыйшла адведаць хворага паэта. Гарун пасля доўгіх гадоў турмы і высылкі страціў здароўе, хварэў на сухоты. У вершы недарэмна згадваецца «Тайга шумячая на шчыце гор» — гэта з жыцця ў сібірскай высылцы. Працаваў на баржы, што плавала па Лене да Якуцка, здабываў золата ў Бадайбо: *«...не раз да болю ў пашчэнках, моцна сціскаючы зубы і мружычыся так, што аж балелі вочы, стараўся... зацікнуць мазгі, каб яны, зрабіўшыся меншымі, не давалі прастору думкам»*. Яшчэ больш сумна робіцца, калі ведаць, што ў тым жа 1920 годзе Алесь Гарун памрэ — паеў свежых вішань, купленых на базары, падхапіў дызентэрыю, арганізм аслаблены... А ў вершы шчымлівае спадзяванне.

*«Прынеслі вы чароўныя дары вясны — пралескі,*
*У добрасці святой іх для мяне сваім зрабіўшы дарам,*
*Як колер гэтых кветачак, так домысл ваш — нябескі, —*
*Прыйсці, парадаваць вясной мяне ў маім замкненні шарым.*
*Зрабіўся мой пакой цяпер — пудэлак цесны мескі —*
*Тайгой шумячаю на шчыце гор, у паблізку к сонцу, к хмарам,*
*Ляжу ў ёй, хваін жывушчы пах п'ючы і горных зёлкаў,*
*А ў думках і ўваччу — праслічная, паўночная фіёлка».*

### «Тугі вясенняе пралескі»

Верш «Пралескі» Уладзімір Жылка напісаў у 1921 годзе. Гэта быў нялёгкі для паэта час. Нядаўні мінскі настаўнік захварэў на сухоты і пераехаў да дзеда на Наваградчыну, на свежае паветра... А ў сакавіку быў падпісаны Рыжскі дагавор, Жылка апынуўся ў Заходняй Беларусі, пад уладай панскай Польшчы. Наперадзе гады змагання... Але пакуль што паэт верыць у найлепшае.

*«І хоць зімы відаць сляды,*
*Яшчэ марозіць часам ночкай,*
*Ды больш не страшаць халады*
*І верыш мілым сінім вочкам.*
*І любы так бясконца мне*
*Яны, з усмешкай ціхай дзеці...*
*Пара іх, кволых, праміне,*
*Прайдуць яны, як усё на свеце.*
*Але ўжо мкне душа мая*
*У сіню даль, за пералескі,*
*І ў сэрцы ўсходзяць — чую я —*
*Тугі вясенняе пралескі».*



### Заляцанні, кветкі, аплявухі

У сатырычнай аповесці Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» з першацветаў згадваецца кветка-сон. Менавіта гэтыя чароўныя, сёння вельмі рэдкія краскі растуць там, дзе малады кар'ерыст Самасуй вырашыў правесці маёўку для жыхароў вёскі Шапялёўка, куды ён дасланы «падымаць культуру». А заадно самаўпэўнены дурнаваты Самсон можа «падбіць кліны» да супрацоўніцы-прыгажуні Крэйны. Праўда, суседства прыгожых кветак не надта дапамагае Самасую ў куртуазных справах:

*«Мы селі на курган недалёка ад усіх. Я моўчкі любаваўся Крэйнай. Ёсць абліччы прыгожыя, як гэтыя сінія кветкі-сон. На іх хочацца глядзець і пакутваць неперапможнымі жаданнямі.*

*Гледзячы на Крэйну, я смяяўся шчаслівым жарабячым смехам. Яна здзіўлена пашырыла свае вочы і чакала, што з гэтага далей будзе. Тады я набраў моцы і сказаў:*

*— Крэйна! Крэйначка! Будзем з табой на ты? Добра?.. Далей слухай, што я скажу. Закахаўся ў цябе я — праўду кажу. Ты павінна звярнуць на маё захапленне максімум увагі. У маім каляндарным плане на сённяшні дзень вызначана два бязвінных пацалункі ад цябе. Гэтага я павінен дамагацца ад цябе, чаго б мне гэта ні каштавала!*

*І сказаўшы гэта, не доўга думаючы, я прыцмактаўся да чырвоных Крэйніных губ і запальна піў агністую кроў дзявоцтва!*

*Прыйшоўшы ў сябе ад неспадзяванасці, Крэйна адштурхнула мяне і так моцна, што ледзьве не загурчэў далоў з кургана. Тон у тон мне Крэйна сказала:*

*— Не цалуй мяне, ты прыцягваеш увагу шырокіх мас!»*

### Забайкальскія пралескі

У апавяданні «Міхасёвы пралескі» Ядвігі Бяганскай дзеянне адбываецца падчас Вялікай Айчыннай вайны ў Забайкаллі. Міхась з мамай прыехалі сюды з Беларусі, «ратуючыся ад вайны, ад фашысцкай няволі».

Але вось бяда — маці цяжка захварэла і трапіла ў бальніцу.

*«А тым часам надыходзіла вясна, набліжаўся сакавік. Міхась успомніў, як штогод восьмага сакавіка ён з таткам прыносіў маці кветкі. Як радавалася яна гэтым першым вясновым краскам! Асабліва яна любіла пралескі. Таткі цяпер няма, і кветкі павінен прынесці ён, сын».*

Але ж вясна ў Забайкаллі наступае пазней, чым у Беларусі, і кветкі пазней паказваюцца. Міхась звярнуўся да дзеда Ягора, у хаце якога жылі. І дзед Ягор надумаў пайсці з хлопчыкам па пралескі на цёплую крыніцу.

*«Міхась ніколі яшчэ не бачыў, каб сярод снягоў біла з-пад зямлі такая цёплая вада. Над крыніцай узнімалася пара, а па беражках зелянела трава, жывая, вясёлая. Дзед Ягор назразаў ладных кавалкаў дзёрну, у якіх праглядвалі раслінкі ў срэбным пушку.*

*— Гэта і ёсць забайкальскія пралескі, — казаў дзед. — Прынясём іх у хату, у цяпло, пачнём паліваць вадзіцай, і яны пойдуць расці і зацвітуць».*

Так што ў хуткім часе Міхась зайшоў у палату да маці, несучы перад сабой букет сініх пралесак. Маці была дужа шчаслівая.

Забайкальскія пралескі завуцца там вяргулькамі, ці ўргулькамі, і фактычна гэта тыя самыя беларускія кветкі-сон, альбо прастрэл. Сібірскія рэаліі Ядвізе Бяганскай былі добра знаёмыя. Яна нарадзілася ў сям'і беларускіх перасяленцаў у Сібіры, вярнулася на Беларусь у 1922 годзе, стала жонкай беларускага паэта, потым ператварылася ў жонку ворага народа і ў гэтай якасці зноў апынулася ў Сібіры... І зноў вярнулася на Беларусь, была рэабілітаваная, працавала на радыё і напісала шмат цікавых кніжак для дзяцей.

### Каханне на фоне кураслепаў

Улюбёная веснавая кветка Уладзіміра Караткевіча, мяркуючы па ўсім, — кураслеп. Упадабаў пісьменнік яе вобраз і дзякуючы знакавай у яго жыцці падзеі. У маі 1959 года ён разам з іншымі слухачамі Вышэйшых літаратурных курсаў у Маскве пабываў на экскурсіі ва Уладзіміры і Суздалі, з наведваннем царквы Пакрава́ на Нерлі. Праводзіла экскурсію іх выкладчыца Ніна Молева. Яна змагла захапіць студэнтаў харастом убачанага, чытала на фоне старажытнага храма літаратурныя творы... Карацей, і да гэтага Караткевіч быў закаханы ў сваю выкладчыцу, а тут яна для яго паўстала проста нейкім ідэалам — чытайце пра гэта ў рамане «Нельга забыць». А адразу па вяртанні з экскурсіі Караткевіч выказаў уражанні ў імпрэсіі «Подыхі продкаў», якая пры яго жыцці не друкавалася:

*«Трава зялёная, як у «Паўночнай ідыліі», кураслеп рассыпаў па ёй сваё тлустае золата, і маленькія браткі падміргваюць нам сінімі вачыма. Але не гэта галоўнае. Там, на краі лугоў, зліўшыся з гэтым, молада-зялёным і залатым, урослы ў гэты просты пейзаж, бачны стройны-стройны белы прамакутнічак са сціплым зялёным купалком...*

*Мы мімаволі паскорылі крокі. Яна плыве да нас, адрываючыся ад зямлі, як кветка, раскрытая небу, як неапалімая купіна, палаючая белым агнём...*

*Гэта было падобна на лікуючае замілаванне другам, гэта была проста радасць, што мы жывём на зямлі, што мы поруч. І гэтаму зусім не патрэбна было канчацца іншым... і горшым. Проста расла ў грудзях хваля ўдзячнасці: у мяне да маёй лепшай на свеце спадарожніцы, а ў яе — да мяне».*

Неаднойчы Караткевіч узнаўляў той пейзаж і ў вершах: *«Успамін. Успамін. Дні пяшчотнай вясны ўспамінаю, На бязмежных лугах кураслепаў халодны пажар...»*, *«Кураслеп на лугах Багалюбава, Белы храм над Нерлю-ракой»*.

Абуджаецца зямля, з веснавой надзеяй пазірае на нас сінімі, блакітнымі, жоўтымі, белымі вачыма першацветаў... Давайце не падманваць яе давер, не рваць пяшчотныя кветкі — а любавацца імі, як любаваліся беларускія паэты і пісьменнікі.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**
**Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.**